| МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ | МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ |
|---|---|
| **ПАСТАНОВА** | **ПОСТАНОВЛЕНИЕ** |
| 20.03.2023 № 56 | |
| г. Мінск | г. Минск |

Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе часткі першай пункта 1 атрыкула 93, пункта 4 артыкула 96, пункта 6 артыкула 97 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзацаў другога і трэцяга падпункта 5.13 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 6 сакавіка 2023 г. № 04-01-02/1, Міністэрства культуры ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”Б“ нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека:

”традыцыйны роспіс на шкле“ ў г. Бярозе, аграгарадку Спорава, аграгарадку Стрыгінь Бярозаўскага раёна і г. Пружаны, в. Слабудка, в. Новыя Засімавічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці;

”традыцыйная тэхналогія ткацтва ”кажушком“ у г. Маларыце, в. Дарапеевічы, аграгарадку Хаціслаў Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці.

2. Раздзел 3 ”Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь“ Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Міністэрства культуры ад 3 студзеня 2023 г. № 1,

пасля пазіцыі

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **”Мінская вобласць** | | | |
| 63БК000160 | стравы з таркаванай бульбы – дранікі, бульбяныя бліны, бабка і іншыя – традыцыі прыгатавання і спажывання Мінскай вобласці | – | Любанскі, Пухавіцкі, Чэрвеньскі раёны | Б | рашэнне Рады 13.05.2022 № 04-01-02/4 | пастанова Міністэрства культуры 16.05.2022 № 28 |
| | | | **Брэсцкая вобласць“** | | | |

Зак. 518.

дапоўніць пазіцыяй

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ”13БК000168 | Традыцыйны роспіс на шкле | – | г. Бяроза, аграгарадок Спорава, аграгарадок Стрыгінь Бярозаўскага раёна г. Пружаны, в. Слабудка, в. Новыя Засімавічы Пружанскага раёна | Б | рашэнне Рады 06.03.2023 № 04-01-02/1 | пастанова Міністэрства культуры 20.03.2023 № 56“; |

пасля пазіцыі

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | ”**Маларыцкі раён** | | | |
| 13АК000139 | Традыцыя выпякання грачанага хлеба | – | аграгарадок Арэхава, в. Брадзяцін, аграгарадок Гвозніца, в. Грушка, в. Дарапеевічы, в. Дрочава, в. Сушытніца, аграгарадок Хацíслаў | А | рашэнне Рады 12.02.2020 № 04-01-02/2 | пастанова Міністэрства культуры 20.02.2020 № 15“ |

дапоўніць пазіцыяй

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ”13БК000169 | Традыцыйная тэхналогія ткацтва ”кажушком“ | – | г. Маларыта, в. Дарапеевічы, аграгарадок Хацíслаў | Б | рашэнне Рады 06.03.2023 № 04-01-02/1 | пастанова Міністэрства культуры 20.03.2023 № 56“. |

Міністр А.М.Маркевіч